# Памяти ученого

# To the memory of scientist

**Мікалай Віктаравіч ЛАЗАКОВІЧ**

**Mikalaj Viktaravich LAZAKOVICH**



23 снежня 2017 г. не стала вядомага беларускага вучонага – доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Мікалая Віктаравіча Лазаковіча.

Нарадзіўся М. В. Лазаковіч 5 сакавіка 1954 г. у г. Бабруйску. У 1971 г. скончыў сярэднюю школу і паступіў на механіка-матэматычны факультэт БДУ. Пасля заканчэння навучання і атрымання дыплома з адзнакай у 1976 г. быў накіраваны ў аспірантуру Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1982 г. абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук. З 1980 г. працаваў на кафедры функцыянальнага аналізу (з 1 верасня 2017 г. – кафедра функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі) БДУ, дзе прайшоў шлях ад асістэнта да прафесара. У 1996 г. абараніў дысертацыю «Дыферэнцыяльныя ўраўненні з выпадковымі функцыямі ў алгебрах абагульненых выпадковых працэсаў» на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Вучонае званне прафесара Мікалаю Віктаравічу было прысвоена ў 2004 г. Ён з’яўляўся вучоным сакратаром савета па абароне дысертацый пры БДУ і членам рэдакцыйных калегій двух навуковых часопісаў.

Асноўныя працы М. В. Лазаковіча прысвечаны лімітавым тэарэмам тэорыі імавернасцей, абагульненым выпадковым працэсам, стахастычным дыферэнцыяльным ураўненням. Навуковая дзейнасць Мікалая Віктаравіча была звязана з даследаваннем мнемафункцый. Прафесар М. В. Лазаковіч пабудаваў канструкцыі алгебр абагульненых выпадковых працэсаў, а на базе створанага апарату алгебр М. В. Лазаковіч распрацаваў новы навуковы накірунак у тэорыі стахастычных дыферэнцыяльных ураўненняў, заснаваны на тонкім аналізе рознасных ураўненняў, што апраксімуюць дадзенае стахастычнае дыферэнцыяльнае ўраўненне. Мікалай Віктаравіч даследаваў новыя класы стахастычных

дыферэнцыяльных ураўненняў, дыферэнцыяльныя ўраўненні з абагульненымі каэфіцыентамі, дыферэнцыяльныя ўключэнні і інш.

Прафесар М. В. Лазаковіч актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы матэматыкаў. Пад яго кіраўніцтвам створана навуковая школа па тэорыі алгебр абагульненых выпадковых працэсаў і яе дастасаваннях. Падрыхтаваў 10 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук.

Акрамя плённай навуковай працы, М. В. Лазаковіч займаўся актыўнай педагагічнай дзейнасцю, выкладаў курс «Тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка», распрацаваў шэраг арыгінальных спецыяльных курсаў, кіраваў дыпломнымі, магістарскімі і аспіранцкімі працамі.

Мікалай Віктаравіч з'яўляўся вядомым спецыялістам па тэорыі імавернасцей, тэорыі выпадковых працэсаў, дыферэнцыяльных ураўненнях, у тым ліку стахастычных. Ён – аўтар больш чым 100 навуковых прац, у тым ліку падручніка з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Тэорыя імавернасцей» (у 2013 г. выйшла ў свет трэцяе выданне падручніка), «Руска-беларускага матэматычнага слоўніка», двух вучэбных дапаможнікаў.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць быў узнагароджаны граматамі БДУ, Граматай (2008) і Ганаровай граматай (2013) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Мікалай Віктаравіч быў знакамітым матэматыкам, высокакваліфікаваным лектарам, духоўна багатым чалавекам з вострым пачуццём гумару. Калектыў механіка-матэматычнага факультэта, кафедра функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім М. В. Лазаковіча. Светлая памяць аб ім застанецца ў нашых сэрцах.

*А. Б. Антаневіч, В. І. Бахцін, В. І. Бернік,
В. В. Гарохавік, В. І. Громак, А. М. Дудзін,
В. А. Еравенка, П. П. Забрэйка, Э. І. Звяровіч,
В. Р. Кротаў, А. У. Лебедзеў, А. А. Левакоў,
М. Х. Мазель, Д. Г. Мядзведзеў, В. І. Піндрык,
С. П. Сташулёнак, У. У. Шлыкаў, А. Л. Яблонскі*